

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

12 МАЯ 2021 г. СЕРАДА № 87 (29456)

САМЫ СВЕТЛЫ ДЗЕНЬ

Фота БелТА.

Выступленне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі на цырымоніі ўскладання вянкоў да манумента Перамогі з нагоды 76-й гадавіны Вялікай Перамогі 9 мая 2021 г.

Паважаныя суайчыннікі!

Дарагія беларусы, ветэраны!

Я звяртаюся сёння да ўсіх жыхароў нашай квітнеючай сінявокай Беларусі. Да тых, хто жыве ў сталіцы нашай рэспублікі — горадзе-героі Мінску. Да ўсіх тых, хто жыве ў гарадах і аграгарадках. Да ўсіх тых, хто жыве ў маленькіх вёсках.

Віншую ўсіх вас з Днём Вялікай Перамогі!

Мы зноў, як і раней, сустракаем пераможны май, які ў далёкім 1945-м мінулага стагоддзя прынёс свабоду беларусам і ўсім братэрскім народам нашай неабсяжнай краіны — Савецкага Саюза.

Чым далей адыходзяць у гісторыю гераічныя і трагічныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны, тым больш велічным і грандыёзным паўстае перад намі ахвярны подзвіг нашых дзядоў і прадзедаў. Тых, хто выратаваў чалавецтва ад заняволення і знішчэння.

Гэта была эпахальная бітва за жыццё на зямлі, за захаванне роду чалавечага. Вялікая перамога дабра над сусветным злом.

Мы схіляемся перад гераізмам і стойкасцю воінаў-франтавікоў, партызанаў, падпольшчыкаў і працаўнікоў тылу, без якіх немагчымая была б Перамога.

Вы, загінулыя ў баях, памерлыя ад ран, паважаныя ветэраны, падарылі нам незгасальнае святло Вялікай Перамогі, пуцяводную зорку, якая будзе вечна свяціць многім пакаленням беларусаў, надаючы сілы для нашай стваральнай працы, для нашага руху наперад і толькі наперад, нягледзячы ні на якія складанасці, праблемы і цяжкасці. Ім было складаней. І яны сёння глядзяць адтуль на нас, і ў іх адно нямое пытанне: выстаім мы ці не? Выстаім.

Беларусь славіць герояў-ветэранаў і заўсёды будзе помніць ваш подзвіг.

Мы схіляемся перад самаадданай працай тых, хто, вярнуўшыся на папялішчы родных гарадоў і вёсак, уздымаў краіну з руін. Нам было цяжэй за ўсіх, таму што на гэтай зямлі не засталося нічога і нікога, акрамя жанчын, дзяцей, інвалідаў і знясіленых салдат, якія вярнуліся з фронту. Мы ўзворвалі і сеялі, выкарыстоўваючы жаночую і дзіцячую працу. Нават коней не засталося.

Мы ніколі не забудзем, што мільёны нашых суайчыннікаў склалі галовы на полі бітвы, згінулі ў лагерах смерці, былі павешаны, расстраляны або закатаваны ў гестапаўскіх засценках. Мы гэта помнім, а хто забыў — нагадаем.

Нізка схіляем галовы перад памяццю тых, хто загінуў.

Смуткуем па ветэранах, якія пайшлі ад нас.

Даваце сёння ўшануем нашых герояў мінутай маўчання.

(Мінута маўчання.)

Кожны год 9 Мая мы прыходзім да манумента Перамогі. Прадаўжаем традыцыю сустрэч франтавікоў і партызанаў каля Вечнага агню і іншых памятных мясцін.

Сёння я задаюся пытаннем, як і вы: ці маглі героі вайны тады падумаць, што праз 80 гадоў іх дзецям і ўнукам давядзецца змагацца за праўду аб Вялікай Перамозе, за права ўшаноўваць у гэты святы дзень воінаў-пераможцаў?

Гэта нельга ўявіць, што ў той час, калі мы клапоцімся пра захаванне памяці, паслядоўнікі акупантаў і іх памагатых — яны папракаюць нас у мілітарызме і праслаўленні вайны. Нас, нашчадкаў тых, якія не прыйшлі з вайны. Кожны трэці. Мы як ніхто іншы зазналі гэтага гора і пастаянна гаворым аб тым, што вайна — страшна. Нам не патрэбна вайна.

Падаплёка іх відавочная. Марачы пра глабальнае панаванне, сучасныя неакаланіялісты наўмысна сеюць нацыянальную варожасць, плодзяць крывавыя канфлікты на планеце і зноў спрабуюць апрануць моладзь у карычневае адзенне — уніформу.

Робяць усё, каб мы забылі подзвіг нашых дзядоў і страшную праўду пра вайну.

Менавіта таму нам навязваюць сцягі і гімны, аганьбаваныя супрацоўніцтвам з гітлераўскімі забойцамі, замест сімвалаў Вялікай Перамогі, міру і стварэння.

Сёння мы павінны адкрыта гаварыць, што беларусы ў гады Вялікай Айчыннай вайны ўпершыню ў сваёй гісторыі сутыкнуліся з масавым і планамерным знішчэннем мірнага насельніцтва.

Гэта на руках фашыстаў, паліцаяў і іншых калабарантаў кроў тысяч і тысяч, мільёнаў бязвінных ахвяр — жанчын, старых і дзяцей.

Свет павінен ведаць і памятаць пра трагедыю нашага народа, беларускага народа. І мы будзем гэтую тэму падымаць на самы высокі міжнародны ўзровень. Каб яны помнілі і не забывалі.

І няхай нашчадкі нацыстаў нават не мараць, што калі пойдуць апошнія сведкі генацыду беларускага і іншых народаў, з імі пойдзе гістарычная праўда.

Дарагія ветэраны!

Вас вельмі няшмат засталося, але вы павінны памятаць і, адыходзячы ад нас, перадаць тым, хто на нас сёння глядзіць адтуль: мы ніколі не здрадзім вашаму подзвігу і нікому не дазволім адабраць у нас вашу Вялікую Перамогу. Тым больш мы нікому не дазволім зганьбаваць усё тое, што вы зрабілі ў сваім жыцці, абараніўшы Еўропу ад карычневай чумы.

Сёння з намі дзеці вайны, якія на свае вочы бачылі, як гітлераўскія вырадкі, прыслужнікі-паліцаі палілі іх маці, братоў і сясцёр, як катавалі і вешалі патрыётаў, як забівалі немаўлят.

Іх галасы гучаць сёння, і мы захаваем кожны з іх у дакументах, кнігах, фільмах.

Нас не будзе, але іх сведчанні абавязкова пачуюць будучыя пакаленні.

Гэта праўда будзе жыць заўсёды!

Дарагія сябры!

Вялікая Перамога — адна з самых грандыёзных падзей у гісторыі беларускага народа, а подзвіг нашых воінаў — сімвал мужнасці, патрыятызму і чалавечнасці.

Прыклад з'яднанасці, дружбы і братэрства людзей розных перакананняў і веры. Невычэрпная крыніца магутнай стваральнай духоўнай энергіі, якая так неабходная нам сёння — у Год нашага адзінства.

Каб захаваць Беларусь, яе суверэнітэт і незалежнасць, нам трэба самае простае — быць побач, з'яднацца. Так, як гэта зрабілі савецкія воіны ў грозныя гады вайны і пасля яе, калі аднаўлялі разбураны і спалены дашчэнту вялікі бацькоўскі дом.

Трэба ўсімі сіламі ўмацоўваць адзінства народа, каб нашы дзеці, унукі і праўнукі, свята захоўваючы гераічную спадчыну продкаў, заўсёды жылі і працавалі ў прыгожай, мірнай і абавязкова шчаслівай краіне.

Дарагія сябры!

Я разумею, пасля тых падзей, якія адбыліся ў мінулым годзе, і таго, што нам абяцаюць у бягучым годзе, мы крыху, ну шчыра кажучы, перанапружылі наша грамадства. Можа, нехта залішне непакоіцца пра мір і бяспеку. Можа, нехта наогул перастаў у гэта верыць. Дык вось я цяпер звяртаюся да вас, да тых, хто не верыць, запомніце: пакуль наша пакаленне жывое, Беларусь заўсёды будзе стаяць намертва. Мы будзем жыць, мы будзем жыць на сваёй зямлі. І я клянуся вам у гэтым святым месцы, што мы ніколі не дазволім глядзець на нашу зямлю з пагардай, тую зямлю, якую вы адстаялі ў гады ліхалецця і адваявалі. Мы будзем яе абараняць, чаго б нам гэта ні каштавала. Я звяртаюся да вас, тых, хто насцярожыўся ў сувязі з апошнімі падзеямі. Нават не думайце і не хвалюйцеся за будучыню сваіх дзяцей, унукаў і за сваю будучыню. Мы зробім усё для таго, каб над нашай зямлёй зазяла вось такое сонца, як сёння, і было блакітнае неба. Мы зробім усё, каб маладыя мамы і таты са сваімі дзеткамі ў любы час сутак маглі выйсці на вуліцу і прайсціся па сваёй зямлі, як гэта было заўсёды. Так будзе. Я вам абяцаю, я клянуся, што так будзе.

І я хачу, каб нас пачулі не толькі ў Беларусі, але там, вы ведаеце, хто.

Са святам Перамогі, дарагія сябры!

ISSN 1990 — 763X

9 771990 763008 21087

Самы светлы дзень

ПАСЛЯ ўскладання вянкоў і кветак да манумента Перамогі (акрамя вянка ад кіраўніка дзяржавы, да помніка таксама былі ўскладзены вянкі і кветкі ад прадстаўнікоў структур дзяржкіравання, грамадскіх аб'яднанняў, дыпламатычнага корпуса, ветэранаў, прадстаўнікоў усіх рэлігійных канфесій) і мінуты маўчання Прэзідэнт пагутарыў з ветэранамі.

«Бачу, што здароўя. Малайцы, трымайцеся! — сказаў Аляксандр Лукашэнка, вітаючы галоўных герояў свята. — Галоўнае, каб вы жылі. Вы нам патрэбныя як апора, каб мы ў сябе верылі. І, шчыра кажучы, нам жа сорамна перад вамі не ўтрымаць тое, што вы нам падарылі».

Прэзідэнт пажадаў ветэранам моцнага здароўя і параіў зрабіць прышчэпкі ад каранавіруса. Таксама беларускі лідар прывітаў кіраўнікоў дыпламатычных місій, якія прысутнічалі на святе, і гледачоў мерапрыемства.

А ветэраны дзяліліся з журналістамі сваімі ваеннымі ўспамінамі і жадалі ўсім аднаго — міру і спакою. У парадных мундзірах, з медалямі, светлымі позіркамі і шчырымі ўсмешкамі — у гэты дзень яны выглядаюць асабліва шчаслівымі. Хоць і прызнаюцца, для іх гэта свята — са слязамі на вачах.

Сваімі рукамі каваў перамогу і Васіль Шышоў, ганаровы старшыня ветэранскай арганізацыі горада Мінска, кавалер ордэна Пашаны. Ён упэўнены, у тыя часы быў важны кожны чалавек: «У гады вайны я працаваў у палку сувязі. Прымаў данясенні ад пастоў, якія былі за

Фота Белта.

лініяй фронту і паведамлялі нам на галоўны пост у Ленінградзе, колькі нямецкіх самалётаў перасякло граніцу, іх месцазнаходжанне... Я з аўтамата не страляў, але выконваў вельмі адказную задачу. Мяне прызвалі з 9 класа, яшчэ 17 гадоў мне не было. Фронт да нас не дайшоў 50 кіламетраў. А ваенкамат баяўся, што немцы зоймуць наш населены пункт і падлеткаў адправяць у Германію, таму нас прызвалі са школьнай парты. Настаўнік фізікі быў адукаваны чалавек, калі пачалася вайна, ён вучыў з намі азбуку Морзэ, і мяне ўзялі ў полк сувязі дзякуючы гэтаму, — расказвае дзядуля. — Нашае пакаленне многае перажыло, пасля вайны, не здымаючы гімнасцёрак, аднаўлялі эканоміку і краіну і перадалі вашаму пакаленню. І хочацца, каб вы гэта бераглі».

Тамара Вішнякова на фронце не была, але поўнасцю спазнала ўвесь жах Вялікай Айчыннай — перажыла 900 дзён блакады Ленінграда. Яна і сёння памятае тыя страшныя дні з голадам, холадам, хваробамі. З яе сям'і выжыла толькі тры чалавекі, а загінула — восем. Тамара Сямёнаўна расказвае, як быў звязаны блакадны Ленінград з Беларуссю: «Я шмат праводжу ўрокаў мужнасці. І расказваю такі момант, які не ўсе ведаюць. У 1940 годзе 15 тысяч беларускіх хлопцаў былі адпраўлены ў Ленінград для атрымання прафесіі токара, зваршчыка, слесара. І ў 1941-м яны збіраліся на канікулы, а тут вайна. І гэтыя 15 тысяч хлопчыкаў стаялі каля станка, дапамагалі рабочым. І з 15 тысяч беларусаў засталося жыць толькі 3 тысячы. У 1996 годзе гэтым хлопчыкам паставілі помнік побач з Піскароўскімі могілкамі ў Санкт-Пецярбургу. Хто калі там будзе, калі ласка, пакладзіце кветкі».

КАМЕНТАРЫЙ У ТЭМУ

«ГЭТЫ ПОДЗВІГ БУДУЦЬ ПАМЯТАЦЬ УСЕ ПАКАЛЕННІ»

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА расказаў журналістам, як вайна закранула яго сям'ю. «На жаль, у жывых няма ўжо маіх бацькоў, цесця, цешчы — яны ўсе былі ўдзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны. Дзядуля ў мяне пахаваны ў Белгародскай вобласці, на жаль, пабываць там не давялося. Мой родны дзядзька, брат бацькі, пахаваны ў Літве, у вёсцы Рудаміна на брацкіх могілках. І там я быў некалькі разоў...

9 мая для нас святы дзень. Я хачу сказаць, што колькі б часу ні прайшло, гэты подзвіг, мужнасць і гераізм нашага народа, дзядоў, прадзедаў усе пакаленні будуць памятаць. І наша задача — шанаваць гэту памяць, не дапусціць перапісвання гісторыі і самае галоўнае — мацаваць магутнасць сваёй краіны сваёй працай. І галоўнае — гэта адзінства народа і каб мы заўсёды, у любой сітуацыі былі моцныя».

«ЯНЫ НАС НЕ ПАДВЯЛІ Ў 1941—1945, І МЫ ІХ НЕ ПАДВЯДЗЁМ»

Для члена Канстытуцыйнай камісіі Аляксея ТАЛАЯ 9 Мая — сакральны святочны дзень. «Мой дзед — ветэран Вялікай Айчыннай вайны, чалавек, дзякуючы якому я сёння жыву і нягледзячы на ўсе хітраспляценні лёсу змог выстаяць, змог працягнуць свой шлях, нарадзіць чацвярых дзяцей, займацца спортам, дасягаць поспехаў. Усё дзякуючы нашым святым людзям, нашым продкам. І мы павінны не дазволіць забраць у нас Перамогу. Пакуль мы дыхаем, мы будзем адстойваць гэтую Перамогу. Яны на нас зверху глядзяць і вераць, што мы іх не падвядзём, як яны не падвялі ў 1941—1945 гадах», — падкрэсліў Аляксей.

Удзельнікі вайны, якія пайшлі з жыцця, 9 Мая таксама апынуліся побач з удзельнікамі святочных мерапрыемстваў — дзякуючы сваім дзецям і ўнукам. Галіна Жарыкава прыйшла з партрэтам бацькі, Фёдара Кашчаева, ускласці кветкі да манумента Перамогі. «Мой бацька — афіцэр-кавалерыст. Ён вёў салдат у бой за Радзіму, за Сталіна. Бацька дайшоў да Берліна. Для мяне 9 Мая — гэта святы дзень. Мама мая была ўрачом на фронце. Сёння я зранку паехала ў храм, заказала малебен, прыехала дадому, узяла партрэт і паехала ўскладаць кветкі да Вечнага агню. Для нас гэта свята», — адзначыла жанчына.

У кожнага з іх свая вайна — на фронце, у акупацыі, у блакадзе. Але ва ўсіх адно пажаданне — берагчы мір і не дапускаць таго, праз што ім прыйшлося прайсці.

Валерыя СЦЯЦКО.

БЕЛАРУСКАМУ НАРОДУ — МІРУ І РОСКВІТУ

У адрас Прэзідэнта Беларусі і беларускага народа паступілі шматлікія віншаванні з 76-годдзем Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Адпаведныя пасланні з пажаданнямі дабрабыту, міру і росквіту беларускаму народу накіравалі замежныя лідары, кіраўнікі інтэграцыйных аб'яднанняў, вядомыя дзеячы розных сфер, паведамілі ў прэс-службе Прэзідэнта.

«Дзень Перамогі — святое свята для расіян і беларусаў. У нашых краінах заўсёды будуць памятаць пра вялікія подзвігі і незлічоныя ахвяры тых, хто абараняў родную зямлю на перадавой і ў партызанскіх атрадах, працаваў у тыле, хто вызваляў іншыя краіны ад нацысцкага прыгнёту. Наш агульны абавязак — акружыць увагай і клопатам удзельнікаў вайны, цвёрда адстойваць праўду пра трагічныя падзеі тых гадоў, разам супрацьстаяць любым спробам фальсіфікацыі гісторыі. Прашу перадаць усім беларускім ветэранам самыя добрыя пажаданні здароўя, дабрабыту, бадзёрасці духу і доўгіх гадоў жыцця», — гаворыцца ў віншаванні ад **прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Уладзіміра ПУЦІНА.**

***

Прэзідэнт Казахстана Касым-Жамарт ТАКАЕЎ падкрэсліў, што ў гэты свяшчэнны дзень мы з асаблівым пачуццём гонару і ўдзячнасці адзначаем бяспрыкладны подзвіг бацькоў і дзядоў, якія самаддана кавалі на палях бітваў і ў тыле Перамогу над фашызмам у імя мірнага жыцця будучых пакаленняў. «Перакананы, слаўныя традыцыі непарушнай дружбы, братэрства і ўзаемнай падтрымкі будуць і надалей служыць трывалай асновай умацавання стратэгічнага партнёрства паміж Казахстанам і Беларуссю», — адзначыў ён.

***

«Я вельмі рады таму, што Вялікая Перамога аб'ядноўвае нашы народы і з'яўляецца адным з самых яркіх сімвалаў дружбы паміж Казахстанам і Беларуссю, праверэных суменснай гісторыяй і змацаваных мільёнамі ніцяў чалавечых лёсаў», — адзначыў у віншавальным пасланні **Першы Прэзідэнт Казахстана Нурсултан НАЗАРБАЕЎ.**

***

Прэзідэнт Азербайджана Ільхам АЛІЕЎ у віншавальным пасланні адзначыў, што Дзень Перамогі займае асаблівае месца ў слаўным летапісе нашых народаў як сімвал бяспрыкладнай мужнасці, гераізму і самаахвярнасці. «Перакананы, што традыцыі сяброўства і ўзаемападтрымкі нашых народаў, якія з гонарам вытрымалі гады суровых выпрабаванняў у Вялікай Айчыннай вайне, і надалей будуць служыць надзейным падмуркам для далейшага развіцця і ўмацавання адносін паміж Азербайджанскай Рэспублікай і Рэспублікай Беларусь», — гаворыцца ў віншаванні ад азербайджанскага лідара.

***

Віншавальныя пасланні таксама паступілі ад кіраўніцтва Арменіі — **Прэзідэнта Армэна САРКІСЯНА і кіраўніка ўрада Нікола ПАШЫНЯНА.** «Гераізм і бяспрыкладны подзвіг усіх тых, хто ўнёс вырашальны ўклад у дасягненне міру, назаўжды застанецца ў нашых сэрцах, а Дзень Перамогі — сімвалам яднання нашых народаў. Упэўнены, што вернасць памяці нашых агульных герояў будзе служыць цвёрдым арыенцірам для развіцця супрацоўніцтва паміж Арменіяй і Беларуссю на карысць народаў нашых краін», — гаворыцца ў віншаванні ад Нікола Пашыняна.

«Нашы народы ўнеслі важкі ўнёсак у дасягненне Вялікай Перамогі, праявіўшы выключную доблесць, мужнасць і згуртаванасць. Сёння наш абавязак — зберагчы мір і свабоду як самае каштоўнае, што падарыла нам пакаленне Пераможцаў», — падкрэсліў Армэн Саркісян.

***

Прэзідэнт Таджыкістана Эмамалі РАХМОН падкрэсліў, што 9 Мая — знамянальная дата ў сучаснай гісторыі нашых краін. «У гэты дзень мы ўшаноўваем бяспрыкладны гераізм, мужнасць, патрыятызм і стойкасць нашых продкаў у бязлітаснай барацьбе супраць ворага, шануем памяць тых, хто сваёй гераічнай працай каваў перамогу ў тыле, — гаворыцца ў віншаванні. — Перакананы, што таджыкска-беларускія адносіны дружбы і шматпланавага супрацоўніцтва, аснову якіх сёння складаюць прынцыпы стратэгічнага партнёрства, і надалей будуць развівацца і прымнажацца ў адпаведнасці з карэннымі інтарэсамі нашых народаў».

***

«Мы ніколі не забудзем, якой цаной была заваявана Вялікая Перамога. Памяць пра подзвіг доблесных воінаў і працаўнікоў тылу назаўжды застанецца ў нашых сэрцах. Яна будзе служыць высокім маральным арыенцірам, асабліва для маладога пакалення, узорам стойкасці і адвагі, патрыятызму і самаадданага служэння Радзіме, — **падкрэсліў Прэзідэнт Узбекістана Шаўкат МІРЗІЁЕЎ.** — Перакананы, што сумеснымі намаганнямі, абапіраючыся на наш гістарычны вопыт і зыходзячы з сённяшніх рэалій, мы будзем і далей умацоўваць традыцыйныя узбекска-беларускія адносіны дружбы і шматпланавага супрацоўніцтва на карысць нашых краін і народаў».

***

Прэзідэнт Кыргызстана Садыр ЖАПАРАЎ у віншавальным пасланні папрасіў перадаць беларускім ветэранам вайны і тылу словы ўдзячнасці за Перамогу і нізкі паклон. «Упэўнены, што падзеі нашай агульнай гісторыі будуць спрыяць далейшаму развіццю адносін паміж Кыргызстанам і Беларуссю ў духу партнёрства і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва», — гаворыцца ў віншаванні.

***

«Дзень Перамогі — гэта светлае свята, што абвяшчае ідэю мірнага суіснавання, добрай волі і гуманізму, — адзначыў у сваім віншавальным пасланні **Прэзідэнт Туркменістана Гурбангулы БЕРДЫМУХАМЕДАЎ.** — Перакананы, што вечная памяць аб вялікім подзвігу нашых продкаў будзе і далей служыць трывалай асновай для далейшага ўмацавання адносін дружбы і ўсебаковага супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі».

***

Віншавальнае пасланне таксама паступіла ад **Прэзідэнта Сірыі Башара АСАДА.** Прэзідэнту і народу Беларусі ён адрасаваў шчырыя віншаванні з Днём Перамогі, пажадаў стабільнасці, далейшага прагрэсу і росквіту. «Карыстаючыся выпадкам, выказваю вам наша імкненне актывізаваць узаемадзеянне для адкрыцця новых перспектыў у супрацоўніцтве паміж нашымі краінамі ва ўсіх сферах на карысць і дзеля дабрабыту нашых двух дружалюбных народаў», — адзначыў сірыйскі лідар.

Віншаванні ў адрас Прэзідэнта Беларусі паступілі і ад высокіх службовых асоб Расійскай Федэрацыі — старшыні ўрада Міхаіла Мішусціна, намесніка старшыні Савета бяспекі Дзмітрыя Мядзведзева, старшыні Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Валянціны Мацвіенкі.

Павіншавалі Прэзідэнта Беларусі і грамадзяне Украіны, беларусы, якія жывуць у гэтай краіне. Так, у адрас Аляксандра Лукашэнкі паступіла віншаванне ад Усеўкраінскага саюза беларусаў. «Прыміце шчырыя і сардэчныя віншаванні ад трохсоттысячнай беларускай дыяспары Украіны з Днём Вялікай Перамогі над фашызмам. Перажываючы за межамі гістарычнай Радзімы, мы бачым, які велізарны клопат у Рэспубліцы Беларусь вы праяўляеце па падтрымцы ветэранаў, робіце ўсё па захаванні памяці пра агульнае гераічнае мінулае беларусаў, рускіх, украінцаў і іншых народаў нашай агульнай Айчыны», — сказана ў ім.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Няхай нашы сімвалы будуць залогам адзінства і згоды»

Невыпадковае супадзенне: сёлета ў першую нядзелю мая Беларусь святкуе не толькі Дзень Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, але і Дзень Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга.

Такое яднанне найважнейшых у гісторыі беларускай дзяржаўнасці свят у Год народнага адзінства Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка назваў знакам непахіснасці нацыянальных традыцый і духоўных каштоўнасцяў. Ён узяў асабісты ўдзел ва ўрачыстым рытуале ўшанавання дзяржаўных сімвалаў на Плошчы Дзяржаўнага сцяга ў Мінску.

На думку Прэзідэнта, герб, сцяг, гімн, Вялікая Перамога — гэта непарыўна звязаныя паміж сабой сімвалы велічы і незалежнасці беларускага народа, у якіх увасоблены лёсавызначальныя дасягненні беларусаў, духоўныя і маральныя рысы нацыі, асаблівасці нашай культуры і светапогляду.

Кіраўнік краіны падкрэсліў, што менавіта народ вызначыў, якія ў нас будуць нашы галоўныя сімвалы. Асобна ён падчас цырымоніі звярнуўся да ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны: «Вас засталося мала, але нізкі паклон усім вам, хто застаўся. Мы сёння схіляем галовы перад тымі, хто сышоў, хто падарыў нам краіну і гэтае жыццё. Ведайце, што за памяць аб вашым гераізме і подзвігу мы будзем змагацца. І мы пераможам, таму што з намі праўда, таму што мы спадчыннікі пераможцаў і мы разам».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што беларусы заўсёды жылі ў спакойнай, мірнай Беларусі, і толькі ў апошні час нас паспрабавалі сутыкнуць ілбамі. «Сёння я магу сказаць: мы разабраліся, дзе праўда, а дзе хлусня. Давайце спынім гэтае не патрэбнае нікому супрацьстаянне. Давайце выразна засвоім, што ўпершыню за тысячагоддзі нам выпала шчасце жыць на гэтым кавалку зямлі і гадаваць сваіх дзяцей, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Давайце нарэшце зразумеем, што іншай зямлі ў нас не будзе і ніхто нам яе не падорыць».

Фота БелТА.

Кіраўнік краіны адзначыў, што сімвалы адлюстроўваюць нацыянальную ідэю — імкненне народа да незалежнага, мірнага і стваральнага жыцця. «І на гэтым гістарычным шляху беларусы ні разу не адступіліся ад сваіх традыцый, каштоўнасцяў і прынцыпаў, — дадаў Аляксандр Лукашэнка. — З нашымі сімваламі мы сталі рэспублікай — заснавальніцай Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, разам з брацкімі народамі перамаглі і зрынулі фашызм, увайшлі ў гісторыю як заснавальнікі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (з гэтымі сімваламі), у цяжкія 1990-я здолелі згуртавацца і выжыць як суверэнная краіна».

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што, нягледзячы на эканамічныя крызісы, у Беларусі былі захаваны прамысловасць і сельская гаспадарка, асвоены космас, развіваюцца перадавыя тэхналогіі, сярод якіх IT і атамная энергетыка. Зроблена гэта ва ўмовах беспрэцэдэнтных выклікаў нашай дзяржаўнасці — эканамічных санкцый і палітычных ультыматумаў.

«Цяпер, прайшоўшы праз чарговыя выпрабаванні, выстаяўшы, мы, сучасныя беларусы, напоўнілі гэтыя сімвалы новым зместам. Зірнуўшы ў твар небяспецы страты дзяржавы, патрыёты Беларусі сёння горда і моцна трымаюць у сваіх руках сцяг — спадчыннік Сцяга Перамогі. А тым, хто робіць замах на святое — гэты сцяг і памяць аб Вялікай Перамозе, — скажу адно: паглядзіце ў вочы яшчэ жывым ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, адчуйце ўсёй сваёй істотай усіх тых, хто глядзіць на нас адтуль, на тых, якія заваявалі Перамогу і якія пайшлі ад нас шмат дзесяцігоддзяў таму. Яны памятаюць «барацьбітоў» за народную волю з бчб-павязкамі на рукавах, якія мала чым адрозніваліся ад фашысцкіх карнікаў, а часам пераўзыходзілі іх па жорсткасці», — сказаў Прэзідэнт.

Паводле яго слоў, удзельнікі вайны ведаюць кошт гэтай «народнай свабоды», акружанай калючым дротам гета і канцлагераў, і беларусы ніколі не прымуць колер здрады сваёй Радзімы, колер дапамогі забойцам і катам беларускага народа. Кіраўнік дзяржавы заявіў, што пачынаецца жорсткі, крывавы перадзел свету і, не дай бог, нам трапіць у гэтыя жорны — самнуць. «Толькі спатыкнуцца — і нас, як гэта бывала не адзін раз у гісторыі, схіляць, аб нас у чарговы раз вытруць ногі і выкінуць на сметнік. Таму што мы воляю лёсу і Госпада размешчаны на геапалітычным разломе», — адзначыў Прэзідэнт.

Ён працягнуў: Беларусь заўсёды станавілася арэнай чужых войнаў, беларускі народ тапталі і забівалі — і старых, і немаўлят. «Няўжо камусьці хочацца зноў паўтарыць гэта ў Беларусі? Мы не павінны гэтага дапусціць. Мы — беларусы, усе тыя, хто сёння тут стаіць і вітае гэтыя сімвалы, і тыя, каго сёння няма, якія маюць іншы пункт гледжання. Мы павінны нарэшце зразумець і ўсвядоміць: мы — беларусы і гэта наша зямля. Мы нікому не павінны яе аддаць і падарыць, — канстатаваў Прэзідэнт. — І няхай нашы сімвалы будуць залогам гэтага адзінства і згоды».

Кіраўнік дзяржавы пажадаў грамадзянам, каб «сімвалы незалежнасці краіны, гераізму, адзінства народа ахоўвалі мір на роднай зямлі, натхнялі нас на новыя здзяйсненні ў імя будучыні любімай Беларусі».

Пасля прамовы Прэзідэнта рота ганаровай варты вынесла на плошчу герб і сцяг. Кіраўнік дзяржавы ўшанаваў сімвалы і перадаў палотнішча Дзяржаўнага сцяга і выяву Дзяржаўнага герба прадстаўнікам моладзі ў знак пераемнасці грамадзянскіх традыцый. Маладыя людзі вымавілі клятву вернасці Дзяржаўнаму сцягу.

Мерапрыемства працягнулася выкананнем Дзяржаўнага гімна артыстамі, ваенаслужачымі і гасцямі цырымоніі.

Завяршыўся рытуал парадам. Над Плошчай Дзяржаўнага сцяга праляцелі два верталёты з выявай сцяга і герба і пяць самалётаў, якія расквецілі неба над Мінскам колерамі Дзяржаўнага сцяга.

Марыя ДАДАЛКА.

ДЛЯ ЗАХАВАННЯ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ І СУВЕРЭНІТЭТУ

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка падпісаў Дэкрэт ад 9 мая 2021 г. № 2 «Аб абароне суверэнітэту і канстытуцыйнага ладу».

Дакументам прадугледжваецца, што ў выпадку гібелі кіраўніка дзяржавы з прычыны замаху, здзяйснення акта тэрарызму, знешняй агрэсіі, іншых гвалтоўных дзеянняў усе дзяржаўныя органы і іх службовыя асобы дзейнічаюць у адпаведнасці з рашэннямі Савета Бяспекі, на пасяджэннях якога старшынствуе прэм'ер-міністр.

Пры гэтым на тэрыторыі краіны неадкладна ўводзіцца надзвычайнае або ваеннае становішча, а Саветам Бяспекі вызначаецца пералік мер па іх забеспячэнні.

Рашэнні Савета Бяспекі абавязковыя для ўсіх і падлягаюць безумоўнаму выкананню.

Асноўным пытаннем будзе пытанне правядзення выбараў. Савет Бяспекі з удзелам губернатараў прыме рашэнне аб іх правядзенні.

Дэкрэт накіраваны на захаванне незалежнасці і суверэнітэту краіны.

Дэкрэт уступае ў сілу з моманту яго падпісання.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

❍ ЭКСПЕРТНАЕ МЕРКАВАННЕ

Каб у краіне былі мір і спакой

Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Наталля КАЧАНАВА:

«Я ніколі не магла падумаць, што такі дэкрэт прыйдзецца прымаць у нашай краіне. Таму што мір, спакой, гарантыі — гэта ўсё тое, што было забяспечана ў нашай краіне заўсёды. І сёння мы робім усё. Але з'явіліся сілы, якія хочуць умішацца ў наша жыццё, у жыццё нашай краіны, народа», — цытуе Наталлю Качанаву БелТА.

Яна падкрэсліла, што ні ў якім разе нельга дапусціць, каб гэты дэкрэт давялося калі-небудзь рэалізоўваць. «Але яго трэба было прымаць, каб паказаць, што ніхто тут сёння, як Прэзідэнт гаворыць, не трымаецца дрыжачымі рукамі за ўладу. Мы хочам зрабіць усё, каб у краіне былі мір і спакой. Каб нашы людзі ніколі не зведалі тых жахаў, якія яны зведалі шмат гадоў таму», — заявіла старшыня Савета Рэспублікі.

«Своеасаблівы ўсенародны абярэг»

Мікалай ШЧОКІН, кандыдат філасофскіх навук, загадчык аддзела сацыялогіі дзяржаўнага кіравання Інстытута сацыялогіі НАН:

«Дэкрэт «Аб абароне суверэнітэту і канстытуцыйнага ладу» Прэзідэнта Беларусі запатрабаваны і прадыктаваны гістарычнымі ўмовамі развіцця і захавання краіны ў прынцыпова новых геапалітычных абставінах. Яны такія, што планамерна і паэтапна ЗША і калектыўным Захадам запушчаны працэс разбурэння краін, якія адстойваюць свае нацыянальныя інтарэсы і якія праводзяць незалежную палітыку. Імі ўжо адпрацавана методыка дзяржаўнага тэрарызму, якую спрабавалі ўжыць у нашай краіне. Таму цалкам лагічна, калі ўлада робіць усе законныя намаганні і крокі па захаванні стабільнасці і міру», — цытуе Мікалая Шчокіна БелТА.

Мікалай Шчокін упэўнены, беларускі народ не зразумеў бы маўчання і бяздзейнасці кіраўніка дзяржавы ў гэты складаны перыяд развіцця краіны. «Будзем шчырыя, калі гаворка ідзе пра выжыванне краіны і народа, то было б неразумна разлічваць на міжнародныя права, еўрапейскую «фашыствуючую дэмакратыю» і свабоды — усёдазволены рэжым знішчэння нацыянальнай ідэнтычнасці і механізм прасоўвання «ідэалаў» заходняй сучаснай палітычнай інквізіцыі, — падкрэсліў ён. — Сапраўды, мала хто мог гіпатэтычна выказаць здагадку, што ў XXI стагоддзі ў краіне, народ якой пераадолеў усе нягоды вайны і стаў народам-пераможцам, дзе ведаюць цану жыццю, міру і дабрабыту, з'явіцца пятая калона — калабаранты — і пры падтрымцы Захаду, яго спецслужбаў і палітычных эліт асмеліцца на дзяржаўны пераварот і фізічнае знішчэнне ўлады».

Трэба прызнаць, у такім становішчы не адна Беларусь. «Дастаткова згадаць, што адбылося ва Украіне, у Грузіі, Югаславіі, Лівіі, Албаніі. І гэта толькі тыя краіны, дзе былі ўзброеныя канфлікты. Практычна ўся Усходняя Еўропа з дапамогай мясцовых карумпаваных эліт апынулася ў заложніках ЗША і геапалітычнай вайне. Таму Дэкрэт «Аб абароне суверэнітэту і канстытуцыйнага ладу» з'яўляецца імунай сістэмай, дзяржаўнай формулай бяспекі, своеасаблівым усенародным абярэгам, механізмам і тактыка-стратэгічным метадам па захаванні Беларусі», — канстатаваў эксперт.

Мікалай Шчокін дадаў: ініцыятыва Прэзідэнта адносна гэтага Дэкрэта цалкам адпавядае пазіцыі большасці грамадзян і так званай апазіцыі, якія патрабуюць навядзення парадку і ўмацавання суверэннасці і незалежнасці краіны. «Дэкрэт № 2 адкрывае магчымасці перагляду ўсіх уразлівых дзяржаўна-грамадскіх канцэптаў у развіцці беларускай дзяржаўнасці. Нават у дзень Вялікай Перамогі мы бачылі супрацьстаянне з народнай памяццю так званай апазіцыі і збеглых. Рашучасць, з якой Прэзідэнт пачаў прыводзіць да прытомнасці здраднікаў і комплексна наводзіць парадак, пачынаючы з гістарычнай памяці і завяршаючы эфектыўнасцю сістэмы дзяржаўнага кіравання, сведчыць аб адным — галоўнай мэтай для беларускага народа з'яўляюцца мір, суверэннасць, незалежнасць і адзінства беларускай нацыі. Лічу, што канстытуцыйнае праектаванне, якое цяпер праходзіць, павінна ўлічваць рэаліі сённяшняга дня і ўключыць у сябе неабходны інструментарый, які адлюстроўвае пытанні бяспекі і стабільнасці беларускай дзяржаўнасці, у тым ліку і ў экстранных, надзвычайных умовах».

Кіраўнікі Беларусі і Расіі дамовіліся аб сустрэчы

9 мая адбылася тэлефонная размова Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Кіраўнікі дзяржаў цёпла павіншавалі адзін аднаго з Днём Перамогі.

Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін абмеркавалі графік сумесных мерапрыемстваў, якія запланаваныя да правядзення ў найбліжэйшыя месяцы як у Беларусі, так і на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі.

У развіццё перагавораў Уладзіміра Пуціна з Прэзідэнтам Таджыкістана Эмамалі Рахмонам, які наведаў з візітам Маскву, бакі абмеркавалі сітуацыю ў зоне адказнасці АДКБ. Прэзідэнты закранулі сітуацыю ва Украіне, а таксама імкненне гэтай краіны да цеснага ўзаемадзеяння з НАТА.

Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін таксама абмяняліся думкамі аб унутранай сітуацыі ў Беларусі і Расійскай Федэрацыі. Прэзідэнты дамовіліся ў найбліжэйшы час сустрэцца і абмеркаваць існуючыя праблемы, якія стаяць перад краінамі.

КАБ БОЛЬШ НЕ БЫЛО

Сёлета значныя дзяржаўныя святы супалі, майскае цяпло трохі памарудзіла ў суботу, калі па краіне праходзілі забегі ў гонар Перамогі 1945 года, і ўсталявалася ў нядзелю — 9 мая. Але ніякая непагода не перашкодзіла настрою, усмешкам, маленькім перамогам у гонар той, галоўнай, пра якую мы памятаем і за якую дзякуем ветэранам — заўсёды маладым, заўсёды жывым, самым прыгожым, дарагім і бясконца любімым нашым Пераможцам.
Пра тое, як прайшлі святочныя дні ў рэгіёнах — у матэрыялах нашых карэспандэнтаў.

• Брэст

Фота Аляксандра ШУЛЬГАЧА.

СПОРТ І ПАМЯЦЬ

Пачалося святкаванне 8 мая ўсебеларускім лёгкаатлетычным марафонам.

На Брэстчыне да яго далучыліся Лунінец і Ляхавічы. У Віцебску даўжыня адной з дыстанцый была 1418 метраў — у памяць пра кожныя суткі вайны. Звыш чатырох тысяч гамяльчан узяло ўдзел у спартыўным свяце, нягледзячы на дождж. Яшчэ каля 600 удзельнікаў сабраў забег на Светлагоршчыне і 300 — у Мазыры. Кожны раён Гродзенскай вобласці вырабіў свае памятныя знакі для ўдзельнікаў усебеларускага забегу ў гонар Вялікай Перамогі. У магілёўскім спаборніцтве ўдзельнічала больш за 1000 марафонцаў. Забегі прайшлі і ў раёнах Магілёўскай вобласці.

• Гомель

Фота Ганны ГАЛІЧАНКІ.

Намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый МАЛАШКА ў размове з карэспандэнтам «Звязды» адзначыў, што такія сімвалічныя мерапрыемствы не толькі аб'ядноўваюць, але і настройваюць на калектыўнае разуменне неабходнасці быць разам, разам пераадольваць складанасці, выхоўваць волю.

Да святочнага забегу далучылася каля трох тысяч жыхароў Міншчыны.

Усюды марафонцы імкнуліся спалучыць спорт і ўшанаванне герояў вайны: ускладалі кветкі да помнікаў, праводзілі мітынгі з выкарыстаннем дзяржаўнай сімволікі.

А ў нядзелю было 9 Мая. Свята стала сапраўды масавым і сонечным.

АСАБЛІВАЕ ГУЧАННЕ

У Брэсце святкаванне ў гэты дзень пачалося на плошчы Леніна ўрачыстым падняццем Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь. Вайскоўцы і студэнты зладзілі кампазіцыю са 100-метровым Дзяржаўным сцягам. Гэта «жывое» палотнішча прамаршыравала ў складзе калоны да самай крэпасці.

Прадстаўнікі працоўных калектываў, устаноў адукацыі, грамадскіх арганізацый святочным строем ішлі да плошчы Цырыманіялаў. Яе запоўнілі сотні гараджан. На самым ганаровым месцы размясціліся ветэраны. Са словамі павагі і падзякі найперш да іх звярнуўся ў прамове **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА.**

«Менавіта тут, каля сцен Брэсцкай крэпасці, вораг убачыў неверагодную сілу духу, гатоўнасць людзей адстойваць кожны метр сваёй Айчыны, — сказаў кіраўнік вобласці. — А сёння мы асабліва разумеем значэнне міру на роднай зямлі. Наша галоўная задача — замацаваць Перамогу рэальнымі справамі, стваральнай працай і развіццём, беражліва захоўваць памяць пра подзвіг бацькоў, дзядоў і прадзедаў».

На мітынгу выступіў **ветэран Вялікай Айчыннай вайны Канстанцін КРУГЛІКАЎ.** На фронт ён пайшоў у няпоўныя 20 гадоў, прайшоў усю вайну. «Наш галоўны ветэранскі наказ вам — цаніце мір і захоўвайце яго. Бо нічога няма на свеце страшнейшага за вайну», — сказаў ён.

Усё менш застаецца ветэранаў Вялікай Айчыннай — на Брэстчыне іх 400 чалавек. Але эфект іх прысутнасці ўзмацняўся дзякуючы ўдзельнікам акцыі «Беларусь памятае», якую правялі прадстаўнікі грамадскасці — яны прыйшлі з партрэтамі родных. Такім чынам усе ўдзельнікі вайны былі «ў страі», разам са сваімі ўдзячнымі нашчадкамі.

Традыцыйна пасля мітынгу адбыўся ўрачысты марш воінаў Брэсцкага гарнізона. Праграму прадоўжыў канцэрт гарадскога духавога аркестра і Брэсцкай пагранічнай групы.

Святкаванні з мітынгамі-рэквіемамі, ускладаннем кветак да памятных месцаў, канцэртамі прайшлі ва ўсіх раёнах вобласці.

АДЗІН З САМЫХ СВЯТЫХ ДЗЁН

У Віцебску пачаткам галоўных мерапрыемстваў, прысвечаных 76-й гадавіне Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне і Дню Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь, стала шэсце па адной з галоўных вуліц — Леніна.

Пазней прайшоў мітынг на плошчы Перамогі — на тэрыторыі мемарыяла ў гонар савецкіх воінаў, партызанаў і падпольшчыкаў Віцебшчыны. У ім узялі ўдзел тысячы гараджан і гасцей горада рознага ўзросту.

Старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай ШАРСНЁЎ і памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — інспектар па Віцебскай вобласці Анатоль ЛІНЕВІЧ, іншыя афіцыйныя асобы, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, ваенныя ўсклалі вянкі і кветкі да Вечнага агню.

«Дзень Перамогі — адзін з самых вялікіх і святых для нашай Айчыны», — сказаў у віншаванні землякам Мікалай Шарснёў. Ён расказаў пра тое, як у рэгіёне захоўваецца памяць аб той страшнай вайне, і паведаміў, што за апошнія пяць гадоў больш за дваццаць тысяч прозвішчаў загінулых герояў упершыню нанеслі на мемарыяльныя плиты на тэрыторыі вобласці.

Мікалай Шарснёў асобна павіншаваў са святам ветэранаў і ад імя жыхароў паўночнага рэгіёна краіны перадаў ім нізкі паклон. Толькі каля 450 удзельнікаў Вялікай Айчыннай засталося ў Віцебскай вобласці...

Кіраўнік рэгіёна падкрэсліў, што ў супадзенні Дня Перамогі і Дня Дзяржаўнага герба і сцяга Беларусі спалучыліся адказнасць за лёс Айчыны, імкненне да стваральнай працы, жаданне жыць у міры і згодзе. «Герб, сцяг, Вялікая Перамога — паняцці, якія сімвалізуюць адзінства і сілу народа, яго вернасць гістарычным традыцыям і накіраванасць у будучыню», — лічыць Мікалай Шарснёў.

Святочныя мерапрыемствы прайшлі ў кожным раёне Віцебшчыны.

НАЛЕЖЫЦЬ УСІМ

Святкаванне ў Гомелі пачалося з узняцця Сцяга Перамогі. Мітынг прайшоў каля будынка ўпраўлення ўнутраных спраў Гомельскага аблвыканкама па вуліцы Камунараў. Узняў Сцяг удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, падпалкоўнік міліцыі ў адстаўцы Мікалай ГРУШАНАЎ разам са сваімі праўнукамі. У мерапрыемстве таксама бралі ўдзел кіраўніцтва абласнога выканаўчага камітэта, органаў дзяржаўнай улады, праваахоўных органаў, супрацоўнікі і ветэраны органаў унутраных спраў. Салютаваў у гонар Сцяга Перамогі ўвесь асабовы склад УУС Гомельскага аблвыканкама.

«Сімвалічна, што гэты важны ў лёсе кожнага з нас дзень мы пачынаем з узняцця Сцяга Перамогі, — звярнуўся да ўдзельнікаў мітынгу **старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ.** — Гэты ўнікальны сімвал, які існуе ў адзіным экзэмпляры, адначасова належыць усім, для каго Перамога савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне была і застаецца знамянальнай падзеяй у гісторыі чалавецтва».

Цырымонія ўскладання кветак і вянкоў да Вечнага агню і брацкай магілы савецкіх салдат прайшла на плошчы Працы. Сюды прыйшлі сотні людзей: кіраўніцтва рэгіёна, ветэраны, маладыя байцы і жыхары горада. Генадзь Салавей нагадаў, што на гомельскай зямлі загінула больш за 200 тысяч савецкіх воінаў. А ў тых, хто вярнуўся, не было часу нават на кароткі адпачынак. Кіраўнік рэгіёна падкрэсліў: у нашых продкаў былі высокія мэты і мары, якія яны самі ажыццявілі. Мала казалі, але шмат рабілі, знаходзілі сілу ў праўдзе і адзінстве. Кіраўнік рэгіёна заўважыў, што невыпадкова гэты год названы Годам народнага адзінства, бо «мы непераможныя, пакуль адзіныя».

Традыцыйнае шэсце ветэранаў, прадстаўнікоў працоўных калектываў і моладзі па цэнтральнай вуліцы Гомеля стала адным з самых кранальных момантаў свята. Сярод тых, хто далучыўся, — **гамяльчанка, ветэран Вялікай Айчыннай вайны Аэліта САМСОНАВА.**

• Касцюковічы

Фота Анатоля КІЦЕЛЬЧУКА.

ВАЙНЫ

• Гродна

Фота БелТА.

«Дзень Перамогі — свята, якое аб'ядноўвае ўсе пакаленні, гэта наша нацыянальная слава і гонар, — упэўнена Аэліта Іванаўна. — Каб узняць пераможны сцяг над Рэйхстагам, трэба было спыніць і разграміць фашыста пад Сталінградам, прайсці праз Курскую дугу, зняць блакаду Ленінграда, вызваліць Беларусь, Украіну, Малдову, Літву, Эстонію, Латвію і Карэлію, краіны Заходняй Еўропы. Было цяжка, часам невыносна, але вера ў Перамогу і самаадданая любоў да сваёй Радзімы нам давала сілы, і мы перамаглі».

Ва ўрачыстым шэсці ў гонар 76-й гадавіны Вялікай Перамогі ўзяло ўдзел каля 15 тысяч жыхароў Гомеля.

Пад гукі франтавых мелодый дзяўчаты ў ваеннай форме ўручылі ўсім прысутным ветэранам букеты кветак. У Гродзенскай вобласці жыве 226 ветэранаў вайны, але далёка не ўсе з-за ўзросту змаглі паўдзельнічаць у масавых мерапрыемствах.

Усіх, хто загінуў на вайне, прысутныя ўшанавалі мінутай маўчання. Каля гранітных пліт з імёнамі загінулых запалілі лампадкі. Страявым маршам прайшоў ваенны аркестр, пасля чаго ўдзельнікі мітынгу — ветэраны, прадстаўнікі ўлад і гродзенцы — усклалі вянкі і кветкі да манумента.

76 ГАДОЎ ШЧАСЦЯ

У Гродне святочныя мерапрыемствы 9 Мая распачаліся на Кургане Славы. Тут пад гукі гімна ўзняўся Дзяржаўны сцяг. Старшыня Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта Уладзімір КАРАНІК падзякаваў ветэранам за іх подзвіг.

«Вайна ператварыла краіну ў руіны, не нарадзілася цэлае пакаленне, але яна ўмацавала дух нашага народа, даказала, што патрыёта можна забіць, але нельга зламаць. Беларусы нікому не дазволяць дыктаваць чужую волю і нікому не аддадуць сваю зямлю, — падкрэсліў ён. — Толькі разам, сумеснымі намаганнямі, мы працягнем рух наперад і зробім нашу любімую Беларусь яшчэ прыгажэйшай і больш зручнай для жыцця. І заўсёды будзем памятаць тых, каму абавязаны сваім незалежным і свабодным жыццём».

Ад імя ветэранаў выступіла Валянціна БАРАНАВА. Гэтая легендарная гродзенка пайшла на фронт у 18 гадоў, дайшла да Берліна, узнагароджаная ордэнамі і медалямі, лаўрэат Кнігі славы Гродзенскай вобласці. Яна згадала сваё юнацтва, якое супала з ваеннымі гадамі, свой клас, які быў гатовы ўсім саставам ісці на вайну.

«Я сёння стаю на гэтай сцэне і нібы не адчуваю сваіх 97-і гадоў, бо бачу сваіх нашчадкаў, новыя пакаленні, якія жывуць у мірнай краіне. Я вельмі шчаслівая, што жыву ў Беларусі, дзе вось ужо 76-ы год адзначаюць Дзень Перамогі», — з хваляваннем сказала ветэран.

ПАМЯТАЕМ. ШАНУЕМ. ДЗЯКУЕМ

Раніцай 9 мая магілёўская плошча Славы ўся была запоўнена народам, многія неслі транспаранты з фотаздымкамі сваіх дзядоў і прадзедаў, невялікія сцягі і кветкі. Жыхары горада і вобласці сабраліся на мітынг цэлымі сем'ямі, разам з малымі дзецьмі.

• Віцебск

Фота БелТА.

Прадстаўнікі працоўных калектываў, грамадскіх аб'яднанняў, моладзь прыйшлі аддаць даніну павагі ўсім тым, хто ваяваў і вярнуўся дамоў або застаўся ляжаць на полі бою. На жаль, да мая 2021 года ў Магілёўскай вобласці дажылі ўсяго 286 ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны.

«Мы заўсёды адзначаем гэтае свята ўрачыста і ўсенародна, усе разам, — звярнуўся да прысутных з прамовай **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Леанід ЗАЯЦ.** — Гэта нашыя памяць і гонар, гісторыя кожнай сям'і, частка душы, якую перадалі нам бацькі, дзяды і прадзеды. 76 гадоў таму савецкі народ прынёс мір усёй планеце, усяму чалавецтву. Перамога была дасягнута вельмі высокай цаной. На яе алтар паклалі жыцці больш чым 20 мільёнаў грамадзян Савецкага Саюза. Наша Беларусь страціла ў вайне кожнага трэцяга жыхара. Яна першая прыняла ўдар вераломнага ворага».

Мінута маўчання і ружэйныя выстралы ў гонар тых, хто не вярнуўся з вайны, віншаванні і песні... У рамках мітынгу на плошчы Славы прайшлі акцыі «Беларусь памятае» і «Ганарымся Радзімай сваёй». Апошняя была прысвечана Дню Дзяржаўнага сцяга і Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь.

У той жа дзень у Магілёве ўрачыста адчыніла свае дзверы першая ў Беларусі крама дзяржаўнай сімволікі на праспекце Міру, 39. На плошчы каля гандлёва-забаўляльнага цэнтра «Атрыум» адбыліся святочны канцэрт, гарадская акцыя «Вальс Перамогі». Тэматычныя экспазіцыі дэманстравалі школьныя музеі і Музей гісторыі Магілёва. Канцэртна-забаўляльная і спартыўная праграмы прайшлі і на цэнтральнай эстрадная пляцоўцы і салдацкай паляне Пячэрскага лесапарку. Каля Дома ветэранаў моладзь правяла танцавальны флэшмоб «Пераможны вальс». У скверы 40-годдзя Перамогі — вечар адпачынку «Пераможны май». Вялікая канцэртная праграма «У славу Вялікай Перамогі» ў выкананні артыстаў Магілёўскай абласной філармоніі і іншых творчых калектываў горада прадоўжыла святочны настрой на пляцоўцы каля гарадской ратушы.

ПЕРАДАЦЬ ДЗЕЦЯМ

Галоўная ўрачыстасць Міншчыны адбылася на Кургане Славы ў Смалявіцкім раёне. Старшыня Мінаблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН усклаў кветкі да мемарыяла.

«Акрамя чалавечых ахвяр, вайна адкінула эканоміку на некалькі гадоў назад. Мы ў кароткі тэрмін змаглі аднавіць народную гаспадарку. Калі б не было вайны, магчыма, мы былі б у сваім развіцці вышэйшыя за Амерыку і Германію, — сказаў ён. — Сёння, на жаль, ветэранаў застаецца ўсё менш. Але мы павінны зрабіць так, каб падрастаючае пакаленне разумела, што было тады, і як не дапусціць гэтага ў будучым».

У свеце ёсць і тыя, хто забыў урокі вайны, дадаў Аляксандр Турчын. Таму важна не даць вялікаму подзвігу застацца толькі ў архівах і навуковых працах.

«У вашых руках, — звярнуўся ён да моладзі, — будучыня нашай незалежнай дзяржавы. Жывіце і працуйце, каб не паўтарыць памылкі мінулых гадоў».

• Магілёў

• Мінск

Фота БелТА.

Дэлегацыя Мінскай вобласці пабывала і на гісторыка-культурным комплексе «Лінія Сталіна».

Урачыстыя мерапрыемствы прайшлі ва ўсіх раёнах Міншчыны і горадзе Жодзіна — мітынгі, ускладанне кветак і вянкоў да брацкіх магіл і мемарыялаў.

Увечары неба Беларусі расквецілася феерверкамі. А перад гэтым прайшла яшчэ адна прыгожая рэспубліканская акцыя: «Праспяваем «Дзень Перамогі» разам».

Святлана ЯСКЕВІЧ, Аляксандр ПУКШАНСКІ, Наталля КАПРЫЛЕНКА, Маргарыта УШКЕВІЧ, Нэлі ЗІГУЛЯ, Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Дзяржаўная падтрымка

Асаблівая ўвага — ветэранам

У Беларусі пражывае больш за 3,3 тысячы ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, а таксама 11,5 тысячы грамадзян, якія пацярпелі ад наступстваў вайны, паведамілі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.

Самым узроставым удзельнікам і інвалідам вайны сёння ўжо больш за 100 гадоў, а самым маладым — каля 90.

«З улікам асаблівага статусу ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і пацярпелых асоб да іх пенсій у адпаведнасці з пенсійным заканадаўствам выплачваецца штомесячная даплата ў выглядзе павышэння пенсіі ад 50 да 500 % мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце, — сказала **начальнік галоўнага ўпраўлення сацыяльнага абслугоўвання і сацыяльнай дапамогі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяна ФЁДАРАВА.** — Такія выплаты да пенсій Герояў Савецкага Саюза складаюць 342 рублі, а ў краіне сёння пражываюць два Героі Савецкага Саюза — Іван Кустаў і Васіль Мічурын».

Інваліды вайны I і II групы атрымліваюць каля 273 рублі ў дадатак да пенсіі, інваліды III групы — 171 рубель.

Удзельнікі вайны, а таксама тыя, хто прымаў удзел у размініраванні тэрыторый у 1943—1945 гадах, атрымліваюць па 171 рублі, блакаднікі Ленінграда і былыя вязні фашысцкіх канцлагераў — па 68 рублёў, па 34 рублі выплачваецца да пенсій тым, хто ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі СССР за самаадданую працу і бездакорную службу ў тыле, і інвалідам з дзяцінства з прычыны раранення, кантузіі, звязаных з вайной.

Членам сем'яў, якія страцілі сваіх мужа ці жонку на вайне і не ўступілі ў паўторны шлюб, выплачваецца надбаўка ў памеры ад 68 да 123 рублёў.

Гэта не адзіныя даплаты да пенсій, якія атрымліваюць ветэраны вайны і асобы, якія пацярпелі ад яе наступстваў. Тыя, хто дасягнуў 75-гадовага ўзросту (а гэта ўжо ўсе, хто нарадзіўся ў гады вайны), атрымліваюць штомесячную ўзроставую даплату. З 1 мая яе памер складае 51 рубель для тых, хто ва ўзросце 75—79 гадоў, ва ўзросце 80 гадоў і старэй — 68 рублёў.

«Акрамя даплаты па ўзросце, дадаткова да пенсій тых, хто дасягнуў 80 гадоў, штомесяц выплачваецца надбаўка на догляд — гэта яшчэ 34 рублі. Тым, хто дасягнуў 80-гадовага ўзросту і з'яўляецца інвалідам I групы, гэтая надбаўка вышэйшая ў два разы — 68 рублёў. Такім чынам, асобам, якія засталі гады вайны, удзельнікам вайны, асобам, якія пацярпелі ад яе наступстваў, выплачваецца тры віды надбавак, дадатковых выплат да пенсіі», — канстатавала прадстаўнік міністэрства.

Такім чынам, сумарны памер штомесячнай даплаты да пенсіі ветэранам вайны на 1 мая бягучага года складае 410 рублёў — інвалідам вайны I групы, 376 — інвалідам вайны II групы, 273 — інвалідам вайны III групы і ўдзельнікам вайны.

У выніку ў маі 2021 года сярэдняя пенсія па ўзросце інвалідаў вайны складае 832 рублі: для інвалідаў I групы — 985 рублёў, для інвалідаў II групы — 940 рублёў, для інвалідаў III групы — 690 рублёў.

Сярэдняя пенсія па ўзросце ўдзельнікам вайны складае 690 рублёў.

У 2021 годзе расходы на пенсійныя выплаты для ветэранаў вайны і грамадзян, якія пацярпелі ад наступстваў вайны, складуць каля 104 млн рублёў (у тым ліку вышэйназваныя надбаўкі і павышэнні).

Ветэраны вайны і пацярпелыя ад яе наступстваў — катэгорыі асаблівыя. Таму ў дачыненні да іх прымяняецца выняўляльны прынцып дадатковай сацыяльнай падтрымкі.

Для гэтага штогод праводзяцца абследаванні матэрыяльна-бытавых умоў іх пражывання. Традыцыйна абследаванне праходзіць у першым квартале, каб да майскіх свят выканаць усе заяўкі. Сёлета абследаваны 14, 7 тысячы прадстаўнікоў гэтых катэгорый. Дапамогу атрымалі каля 850 чалавек. Гэта прыбіранне жылых памяшканняў, прыдомавай тэрыторыі, забеспячэнне дровамі, а таксама мерапрыемствы, якія накіраваны на падтрымку бяспекі пражывання пажылых людзей: рамонт жылых памяшканняў, печаў, электраправодкі, газавага абсталявання і гэтак далей. Дадаткова на працягу года ўсе заяўкі будуць аператыўна выконваць. Да гэтага падключаюцца валанцёры, арганізацыі, прадпрыемствы.

Тыя, хто мае патрэбу ў дадатковай падтрымцы, карыстаюцца сацабслугоўваннем, якое аказваюць тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва і дамы-інтэрнаты.

Нагадаем, што ў краіне 146 тэрытарыяльных цэнтраў (яны размяшчаюцца ў кожным адміністрацыйным раёне рэспублікі) і 83 дамы-інтэрнаты для дарослых.

З ліку ветэранаў вайны і пацярпелых больш за дзве тысячы карыстаюцца сацыяльнымі паслугамі на доме. Такія паслугі па заканадаўстве аказваюцца на ўмовах аплаты гэтым катэгорыям, але па рашэнні мясцовых органаў улады ўсе ветэраны Вялікай Айчыннай вайны вызвалены ад аплаты за хатняе сацыяльнае абслугоўванне.

У дамах-інтэрнатах кругласутачную сацыяльную медыцынскую дапамогу атрымліваюць 132 чалавекі названых катэгорый. Акрамя таго, за 711 ветэранамі і пацярпелымі грамадзянамі ажыццяўляецца індывідуальны догляд членамі сям'і з выплатай тым, хто іх даглядае. Памер гэтай дапамогі складае бюджэт пражыткоўца мінімуму — крыху больш за Br273.

Таксама ветэранам вайны і асобам, якія пацярпелі ад яе наступстваў, аказваецца шырокі спектр сацыяльных ільгот. Ветэраны атрымліваюць ільготы ў сферы аховы здароўя і санаторна-курортнага лячэння, на праезд у грамадскім транспарце, на аплату жыллёва-камунальных паслуг. А гэта і бясплатнае забеспячэнне лекавымі сродкамі, бясплатны выраб і рамонт зубных пратэзаў, бясплатнае забеспячэнне тэхнічнымі сродкамі сацыяльнай рэабілітацыі, першачарговае забеспячэнне бясплатным санаторна-курортным лячэннем. Калі ж Герої Савецкага Саюза альбо інваліды і ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны не скарысталіся сваім правам, то ім выплачваецца грашовая дапамога на аздараўленне — 10 базавых велічынь.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

З нагоды

ТЭЛЕМОСТ ПАМЯЦІ

«Пераможная пераклічка» звязала гарады-героі і Брэсцкую крэпасць

З нагоды Дня Перамогі ў фармаце відэаканферэнцыі адбылася «Пераможная пераклічка гарадоў-герояў», што аб'яднала прадстаўнікоў 11 гарадоў, якія выйшлі на сувязь. Далучылася да відэаканферэнцыі і Брэсцкая крэпасць-герой.

Пандэмія ўнесла свае карэктывы, таму сустрэча прадстаўнікоў гарадоў-герояў прайшла на віртуальнай пляцоўцы — выдатная магчымасць не здраджваць традыцыям. Адзін за другім на сувязь выходзілі Керч, Тула, Мурманск, Масква, Санкт-Пецярбург, Севастопаль, Новарасійск, Мінск, Валгаград, Смаленск, Адэса, Брэсцкая крэпасць.

Падчас прамога ўключэння выступілі прадстаўнікі адміністрацый гарадоў-герояў, дэпутаты, удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, члены ветэранскіх, маладзёжных і пошукавых арганізацый, школьнікі. Кожны з выступоўцаў расказаў пра свой горад, які моцна пацярпеў у вайну, але здолеў адрадзіцца, стаць прыгожым сучасным мегаполісам, у чым можна было пераканацца дзякуючы відэаролікам.

Як адзначыла намеснік старшыні Саюза гарадоў-герояў Яна Судаева, магчымасць віртуальнага ўдзелу кожнага з гарадоў-герояў, шчырыя вітальныя словы ў адрас адзін аднаго напаўняюць радасцю сэрцы. «Спадзяёмся, што тая сувязь, якая ўстанавілася паміж намі ў працэсе падрыхтоўкі эфіру, будзе абавязкова мацнець і праяўляцца ў новых справах і праектах, накіраваных на захаванне гістарычнай памяці і подзвігу нашага народа ў Вялікай Айчыннай вайне», — удакладніла Яна Судаева.

8 мая 1993 года ў горадзе-герої Севастопалі быў створаны Міжнародны саюз гарадоў-герояў СНД як саюз грамадскіх рухаў за захаванне брацкіх сувязяў. У саюз уваходзяць грамадскія аб'яднанні 12 гарадоў-герояў і Брэсцкая крэпасць-герой.

Мінск падчас прамога ўключэння прадставіла сярэдняя школа № 97, якая першая ў нашай краіне займела ганаровы статус Школы міру. З лёгкай рукі каардынатара руху Школ міру ў Беларусі Ганны Пушкарэвіч ганаровы статус быў прысвоены і некалькім школам Расійскай Федэрацыі.

— Мы з 2001 года ўдзельнічаем у Міжнародных злётах школ гарадоў-герояў, — расказала дырэктар сярэдняй школы № 97 Галіна Бандзік. — З'яўляемся адной з першых устаноў агульнай адукацыі, якая падтрымала ініцыятыву праграмы «Памяць свяшчэнная», прымеркаваную да рэалізацыі мерапрыемстваў грамадзянска-патрыятычнага выхавання. Актыўна бяром удзел у міжнародных злётах, пабывалі практычна ва ўсіх гарадах-героях. Чатыры разы арганізоўвалі міжнародныя злёты ў нашай школе. Увогуле ў нас праводзіцца шмат мерапрыемстваў, прысвечаных перамозе савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Гэта чэленджы «Мы помнім, чакаем», «Я ведаю аб Перамозе…», дзеці пішуць шматлікія эсэ, сачыненні. Стэнд у кабінеце гісторыі «У страі заўсёды — у памяці навечна» распавядае пра тых людзей, што ўдзельнічалі ў ваенных падзеях. Інфармацыя пастаянна дапаўняецца тымі звесткамі, якія прыносяць аб сваіх продках школьнікі.

Вераніка КАНЮТА.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР 8 мая 1965 года было зацверджана палажэнне аб ганаровым званні «Горад-герой». Першымі медалі «Залатая Зорка» атрымалі Ленінград, Кіеў, Валгаград, Севастопаль, Адэса і Масква. Брэсцкай крэпасці было прысвоена званне «Крэпасць-герой». Мінск стаў горадам-героем 26 чэрвеня 1974 года.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ
НА СТРОИТЕЛЬСТВО ОБЪЕКТА

«Многоквартирный жилой дом в границах ул. Шаранговича, улица Панченко – МКАД»

Застройщик: ОАО «Минский домостроительный комбинат» зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей решением Мингорисполкома 14 февраля 2001 г. за № 100258980.

Юридический (почтовый) адрес: 220015, г. Минск, ул. Пономаренко, 43.

В течение трех предшествующих лет ОАО «Минский домостроительный комбинат» в качестве заказчика построены следующие объекты: «Реконструкция застройки территории в районе улиц Михалова, Алибегова. Жилой дом № 13» март 2017 – февраль 2018, «Многоквартирный жилой дом на ул. Серова на месте снесенного дома № 54» март 2019 – декабрь 2019, «Многоквартирный жилой дом с подземной гараж-стоянкой со сносом здания по просп. Партизанскому, 71Б» февраль 2019 – сентябрь 2020.

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОЕКТЕ СТРОИТЕЛЬСТВА

16-этажный жилой дом на 127 квартир запроектирован в границах ул. Шаранговича – ул. Панченко – МКАД на территории жилого района Сухарево во Фрунзенском административном районе г. Минска.

Конструктивное решение здания – объемные конструктивно-планировочные модули ОКПМ. Наружные стены – трехслойные железобетонные. Высота типового этажа – 2,8 м.

В каждой секции запроектирована одна эвакуационная лестничная клетка и два лифта.

На 1 этаже запроектированы 1-, 2-, 3-комнатные квартиры, внеквартирные помещения, помещение товарищества собственников, электрощитовая.

На типовом этаже запроектированы 1-,2-,3- комнатные квартиры:
1-комнатные – 32 шт., общая площадь 49,28 – 49,51 м²,
2-комнатные – 63 шт., общая площадь 66,24 – 73,47 м²,
3-комнатные – 32 шт., общая площадь 96,78 – 103,87 м².

Во всех квартирах предусмотрена полная планировка, организованы жилые комнаты, кухни, санузлы, прихожие, кладовые помещения.

Окна – профиль ПВХ с двухкамерными стеклопакетами.

Внутренняя отделка квартир: стены – обои, акриловая покраска, потолки – обои, акриловая покраска, покрытие пола – керамическая плитка, линолеум на теплозвукоизолирующей подоснове.

Благоустройство территории включает организацию проездов и парковок, формирование сети пешеходных тротуаров, дорожек, детских площадок, площадок для хозяйственных нужд, озеленение территории. Проектируемый объект обеспечен социальной инфраструктурой на прилегающих территориях. Проектом предусмотрены автомобильные парковки, суммарной вместимостью 79 машино-мест. Жилой дом обеспечен социальной инфраструктурой, размещенной на территории окружающих микрорайонов, располагающих необходимым количеством объектов социально-гарантированных услуг, обеспечивающих создание полноценной жизненной среды.

Нормативный срок строительства – 11,5 месяцев.
Начало строительства объекта – 2 квартал 2021 г.
Плановый срок ввода в эксплуатацию – 2 квартал 2022 года.

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади объекта долевого строительства на день опубликования проектной декларации в текущих ценах с учетом прогнозных индексов в нормативный период строительства с выполнением отделочных работ составляет для нормируемой и сверхнормативной площади 1771,36 белорусских рублей.

Стоимость квадратного метра сформирована без учета затрат застройщика, не включенных в сводный сметный расчет стоимости строительства объекта долевого строительства, но относимых на стоимость строительства. Данные затраты будут предъявлены дольщику по окончании строительства с заключением дополнительного соглашения, оставшаяся сумма оплачивается ежемесячно в соответствии с графиком платежей, являющимся приложением к договору.

Строительство жилых помещений будет осуществляться в соответствии с заключенными договорами долевого строительства.

Заключение договоров с дольщиками осуществляется в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 10.12.2018 г. № 473 «О долевом строительстве объектов в Республике Беларусь».

В соответствии с п. 1. Решения Мингорисполкома от 22.04.2021 г. № 1240 «Об изъятии и предоставлении земельных участков, и разрешении строительства» Заказчику – ОАО «Минский домостроительный комбинат» поручено осуществить строительство жилых помещений в составе объекта «Многоквартирный жилой дом в границах ул. Шаранговича, улица Панченко-МКАД» для граждан, в первую очередь многодетных семей, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях районов г. Минска, по направлениям соответствующих администраций.

проектная документация, прошла в установленном порядке государственную экспертизу № 657-15/20 от 16.12.2020 г. и утверждена приказом ОАО «Минский домостроительный комбинат» от 19.02.2021 г. № 75;

извещение о получении уведомления и регистрации объекта строительства Инспекции Госстройнадзора по г. Минску от 04.05.2021 № 2-208Ж-019/21.

Заказчиком и генеральным подрядчиком по строительству объекта выступает ОАО «Минский домостроительный комбинат».

Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после ввода объекта в эксплуатацию: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые, вентиляционные и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами жилых и (или) нежилых помещений, но обеспечивающее их жизнедеятельностью.

Заключение договоров долевого строительства будет производиться по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 43, каб. 304Б через семь календарных дней после опубликования проектной декларации, с 19 мая 2021 г.

Первоначальный взнос вносится в течение 7 календарных дней с даты регистрации договора в Мингорисполкоме в размере 10 % от стоимости договора.

Для заключения договора необходимо: направление администрации района г. Минска, личное присутствие гражданина либо его представителя, действующего по доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке, паспорт (+ксерокопия) гражданина с которым будет заключаться договор.

Режим работы для приема заявлений и заключения договоров: понедельник – пятница 8.30–16.30, конт. тел.: (017) 3954860, (044) 7771158.

Антикризисный управляющий торгового унитарного предприятия «Торговый дом «Оптим» – ООО «Форхэнд» (организатор торгов) извещает о проведении 11.06.2021 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Тростенецкая, 5, пом. 221 открытых торгов по продаже дебиторской задолженности торгового унитарного предприятия «Торговый дом «Оптим»:

индивидуальный предприниматель Данилевич Виктор Александрович (размер задолженности – 1 260,00 BYN) – первоначальная цена – 1 260,00 BYN; общество с ограниченной ответственностью «Технофриз» (размер задолженности – 9 502,02 BYN) – первоначальная цена – 9 502,02 BYN.

Шаг аукциона – 5 % от цены лота. Задаток для участия в аукционе – 5 % от цены лота. Прием заявлений на участие в торгах осуществляется по почтовому адресу: 220123, г. Минск, а/я 69, с даты настоящей публикации по 10.06.2021 г. Оплата задатка производится **с даты настоящей публикации по 10.06.2021 г. вкл.** на р/с торгового унитарного предприятия «Торговый дом «Оптим» р/с BY57 OLMP 3012 1000 2360 5000 0933 (BYN) в ОАО «Белгазпромбанк», код OLMPBY2X, УНП 191329094.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену. Заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 10 дней со дня проведения торгов. Победитель торгов в течение 5 рабочих дней со дня заключения договора купли-продажи оплачивает цену за минусом внесенного задатка. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов. Уведомление участников об итогах торгов в день торгов, публично. Возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. Участие в торгах и результаты торгов оформляются итоговым протоколом в день их проведения. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником предмет торгов может быть реализован этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Организатор может отказаться от проведения торгов не позднее чем за один день до их проведения.

УНП 191329094

Белыя абрусы на радзіме Паэта

Касцюковіцкі раён трыццаць пяць гадоў таму пацярпеў ад аварыі на Чарнобыльскай атамнай станцыі, і некаторыя вёскі былі адселены. Але былыя жыхары вяртаюцца на радзіму. Адзін раз на год — на Радаўніцу. Вось і самая вялікая вёска Саматэвічы — радзіма народнага паэта Беларусі Аркадзя Куляшова, таксама апынулася ў зоне адсялення і перастала існаваць. У 1989—1991 гадах жыхары гэтага населенага пункта пераехалі ў вёску Новыя Саматэвічы. І мне ўдалося пабываць у двух Саматэвічах. Спатачку ў... выселеных, у якіх засталася толькі паўразбураная царква і могілкі, на якіх ужо не хаваюць. Але былыя вяскоўцы і іхнія нашчадкі прыязджаюць і прыбіраюць могілкі, а потым засцілаюць на іх абрусы. Такая нязменная памінальная традыцыя гэтага рэгіёна. У гэты дзень, як сонца ўзыдзе, жанчыны прыходзяць на клады і кожную магілу засцілаюць. І сыходзяць. Могілкі скрозь свецяцца белымі палотнамі. А днём зноў ідуць — з раднёю, сваякамі, суседзямі, каб сустрэцца з землякамі, пагаварыць і, вядома, памянуць нябожчыкаў...

Праязджаючы па навакольных вёсках, я спыняўся ў Белай Дуброве і Студзянцы — там таксама шануюць традыцыю. Нават на могілках неіснуючых вёсак Мамонаўка і Зелянкі я сустракаў былых жыхароў, якія таксама расцілалі белыя абрусы.

Анатоль КЛЯШЧУК,
фота аўтара.

Круглы стол

АДСТАЯЦЬ ПРАЎДУ

Тэма захавання гістарычнай памяці блізкая сучаснай моладзі

Шматлікія спробы фальсіфікацыі гістарычных фактаў, звязаных з падзеямі Другой сусветнай вайны, якія асабліва пачашчаюцца напярэдадні памятных для беларускага народа дат, вымушаюць навукоўцаў, журналістаў і грамадскіх дзеячаў рэгулярна звяртацца да мінулага, адстойваць гістарычную праўду. Своеасабліва адказам псеўдагісторыкам стаў круглы стол «Каб памяталі. Карныя аперацыі нацыстаў на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Усенародная партызанская барацьба. Уклад сучаснай моладзі ў пошукавы рух», які адбыўся ў прэс-цэнтры Дома прэсы.

Як паведаміў **начальнік управаўлення па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў Узброеных Сіл Міністэрства абароны Беларусі Сяргей ВАРАНОВІЧ,** сёлета палявыя работы запланаваны на 147 пошукавых аб'ектах у 48 раёнах усіх абласцей краіны, а таксама ў Мінску і Гродне. «Палявыя пошукавыя работы ўжо праведзены на шасці планавых і трох дадатковых аб'ектах, — удакладніў начальнік управаўлення. — Мясцовым выканаўчым і распарадчым органам для далейшага перапахавання перададзены астанкі 360 загінулых. За дадзены перыяд выяўлены чатыры ўзнагароды: тры медалі «За адвагу» і адзін «За баявыя заслугі». Установлена пяць імён загінулых. Акрамя таго, сёлета плануецца правядзенне палявых пошукавых работ на сямі аб'ектах, дзе, па папярэдняй інфармацыі, знаходзяцца пахаванні ахвяр генацыду: мясцовага насельніцтва і савецкіх ваеннапалонных».

У адпаведнасці з пастановай Міністэрства абароны, у палявых пошукавых работах разам з вайскоўцамі 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна могуць удзельнічаць і прадстаўнікі грамадскіх арганізацый. Актыўна да пошукавай работы далучаецца моладзь. Аб тым, што тэма захавання гістарычнай памяці не чужая для сучасных падлеткаў і маладых людзей, сведчыць і шэраг патрыятычных праектаў, рэалізаваных Беларускім рэспубліканскім саюзам моладзі.

— У прыватнасці, два гады таму мы ініцыявалі праект па стварэнні нацыянальнага альбома памяці «Беларусь памятае. Родныя твары Перамогі», — удакладніў **другі сакратар Цэнтральнага камітэта Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі Аляксандр ПРОХАРАЎ.** — Амаль кожны з членаў нашай арганізацыі сабраў інфармацыю аб сваім дзядулі, прадзядулі, які прымаў удзел у Вялікай Айчыннай вайне. У выніку найбольш цікавыя фотагісторыі ўвайшлі ў асобнае выданне. Таксама створаны віртуальны фотаальбом, які можна ўвесь час дапаўняць. Актыўна працуем у мемарыяльным комплексе «Трасцянец»: наша задача — узнавіць памяць аб нашых суайчыннiках, якія прайшлі праз канцлагер, праз гэтую машыну смерці».

Дацэнт кафедры гісторыі паўднёвых і заходніх славян гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Сяргей АЛЕКСАНДРОВІЧ спыніўся на тактыцы і эфектыўнасці партызанскага руху на тэрыторыі Беларусі, каторы раз развеяў многія міфы, звязаныя з партызанамі. Адзін з самых распаўсюджаных — карныя аперацыі нямецка-фашысцкіх захопнікаў з'яўляліся адказам на антыфашысцкія дзеянні партызан. Аднак апраўданні бесчалавечнасці гітлераўцаў быць не можа. «Калі паглядзець на практыку нямецка-фашысцкіх войскаў, то яшчэ да таго, як партызанскі рух на тэрыторыі Беларусі набыў масавы характар, карныя аперацыі ўжо ажыццяўляліся: людзей знішчалі альбо па факце іх этнічнай прыналежнасці, як яўрэяў, альбо па той прычыне, што некаму падалося, што яны маюць пэўныя сувязі з партызанамі, — падкрэсліў **вучоны сакратар Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Валерый НАДТАЧАЕЎ.** — Такі крывавы шлейф за акупантамі цягнецца з самых першых тыдняў Вялікай Айчыннай вайны. У экспазіцыі чацвёртай залы нашага музея, дзе раскрыта тэма абароны Магілёва, змяшчаецца фотаздымак камандзіра 172-й стралковай дывізіі Міхаіла Раманава. У час прарыву з акружэння генерал-маёр быў паранены. У вёсцы Барсукі хавала Раманава, а таксама аказвала яму медыцынскую дапамогу сям'я Асмалоўскіх. 22 верасня 1941 года, падчас прачэсвання мясцовасці, гітлераўцы даведаліся, што ў хаце Асмалоўскіх хаваецца паранены савецкі афіцэр. Генерала ўзялі ў палон, сям'ю разам з суседзямі (усяго 13 чалавек!) расстралялі. Ніякай сувязі гэтая сям'я з партызанамі не мела...»

«Гэтае мерапрыемства і падобныя, якія апошнім часам праводзяцца, маюць мэту адэкватнай ацэнкі геапалітычных зрухаў, якія цяпер адбываюцца ў свеце, сутнасці глабальнай нестабільнасці і спроб канчатковай ліквідацыі Ялцінска-Патсдамскай сістэмы забеспячэння міжнароднай бяспекі, — зазначыў **прафесар кафедры ідэалагічнай работы і сацыяльных навук Ваеннай акадэміі Беларусі Уладзімір МАКАРАЎ.** — Пакуль памяць аб Вялікай Айчыннай вайне, аб Вялікай Перамозе з'яўляецца тым бар'ерам, які не дазваляе здзейсніць бліцкрыг у глабальным маштабе. Уся Беларусь — гэта вялізны помнік. Помнік нескараному народу. Хто не памятае свайго мінулага, асуджаны перажыць яго зноў».

Вераніка КАНЮТА.

Падзея

АДДАЦЬ ДАНІНУ ПАВАГІ І ПЕРААДОЛЕЦЬ СЯБЕ

«Забег адважных» прайшоў у Мінску

Дзень Перамогі сталічныя аматары спорту адзначылі ў спартыўным рытме. Традыцыйны, пяты «Забег адважных» прайшоў у Мінску. На старт выйшла 2500 смелых, адважных, моцных аматараў бегу і спорту, сярод іх — 500 дзяцей.

Прывітаў удзельнікаў «Забегу адважных» **міністр спорту і турызму Рэспублікі Беларусь Сяргей КАВАЛЬЧУК.** Па яго словах, забег — гэта выдатная магчымасць спалучыць гістарычную памяць і любоў да спорту.

«Мы абавязаны гэта рабіць, каб аддаць даніну павагі і памяці ўсім людзям, што загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. На нашу краіну выпаў вялікі цяжар, многія страцілі блізкіх. І гэта даніна павагі людзям, якія перамаглі, якія сёння бачаць, як мы такім чынам ушаноўваем іх. Сёння няпростыя ўмовы надвор'я, удзельнікам — і дзецям, і дарослым — складана. Але, калі падумаць аб тым, што перажылі нашы дзяды і прадзеды, то сённяшнія выпрабаванні — дробязь», — адзначыў міністр.

Самым малодшым удзельнікам забегу — усяго чатыры гады. Менавіта праўнукі Перамогі адкрылі «Забег адважных». Малыя ад чатырох да васьмі гадоў пераадольвалі дыстанцыю ў 400 метраў, а старэйшыя спартсмены — 1200 метраў. Не абышлося без перашкод. Аўтамабільныя покрыўкі, лабірынты, БТР, пад якім трэба было прапаўзці — удзельнікі забегу справіліся з усім. Памятнымі медалямі маленькіх спартсменаў на фінішы ўзнагароджваў міністр спорту і турызму.

Траса традыцыйнага забегу кожны год аднолькавая. Пастаянныя ўдзельнікі ведаюць, да якіх перашкод рыхтавацца, але гэта не робіць іх лягчэйшымі. Перашкоды вышэйшыя за чалавечы рост, поўзанне пад калючым дротам, перанос мяшка з пяском, лазенне цераз БТР — толькі адважныя людзі змаглі з гэтым справіцца. Ускладніла забег і надвор'е. У халодны дзень скакаць у Свіслач, праходзіць марш-кідок па рэчцы асмеліцца не кожны. Максімальная дыстанцыя, якую пераадолелі адважныя спартсмены — 2100 метраў. У абсалютным заліку перамаглі Андрэй Сушчэня і Марыя Гнедчык. Але без прызоў не застаўся ніхто. Абсалютна кожны ўдзельнік «Забегу адважных» атрымаў медаль і памятныя падарункі ад спонсараў і арганізатараў.

«Забег адважных» сабраў людзей розных узростаў, прафесій, інтарэсаў, аб'яднаных любоўю да спорту і агульнай мэтай — пераадолець сябе.

«Я займаюся спортам большую частку жыцця. Стараюся не толькі бегаць, але і наогул займацца рознымі відамі, па меры сваіх сіл і ўзроставых магчымасцяў. Велізарны стымул, каб падтрымліваць сябе ў форме, дала армія. На «Забегу адважных» я першы раз. Мне вельмі спадабалася, прыгожае мерапрыемства ў памяць пра Вялікую Перамогу, пра нашых дзядоў, якія нам гэтую Перамогу падарылі. Мой дзед Сільвановіч Ісак Філіпавіч меў медаль за адвагу. Мы ганарымся ім і стараемся не адставаць ад тых, хто даў нам перамогу ў Вялікай Айчыннай Вайне», — расказаў Мікалай Шчурпак.

«Забег адважных» стаў магчымасцю не толькі праверыць свае сілы, але і цікава правесці час разам з сябрамі, сем'ямі. Ды і падтрымкі блізкіх людзей на такіх мерапрыемствах шмат не бывае. Юлія Фадзеева пераадольвала сябе разам з дачкой Ірынай і сяброўкай.

«Я на забегу першы раз, не буду ўтойваць — было страшна. Я не чакала, што мне хопіць рашучасці, каб прайсці гэтае нялёгкае выпрабаванне, аднак мы ўтрох адолелі гэтыя кіламетры і прыйшлі да фінішу», — сказала Юлія Фадзеева.

А яе сяброўка Настасся Каледа дадала, што такія спаборніцтвы здольныя пераплятаць лёсы. «Я ў захапленні ад гэтага мерапрыемства, яно выдатна аб'ядноўвае і звязвае людзей. А таксама дае добры стымул да таго, каб займацца спортам, тым больш перад 9 Мая».

Напярэдадні Дня Вялікай Перамогі розныя спартыўныя забегі прайшлі ва ўсіх рэгіёнах краіны.

Валерыя СЦЯЦКО.
Данііл СКАРАПАНАЎ.
Фота Аліны МАЗАВЕЦ.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.12	21.01	15.49
Віцебск —	4.56	20.56	16.00
Магілёў —	5.02	20.51	15.49
Гомель —	5.05	20.41	15.36
Гродна —	5.29	21.15	15.46
Брэст —	5.26	21.09	15.43

Месяц

Маладзік 11 мая. Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Арцёма, Васіля, Івана, Фядота, Філімона.* ***К.*** *Яны, Германа, Дамініка, Панкрата, Яна.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

12 МАЯ

У краіне

1901 год — пры садзейнічанні гарадскога кіраўніка графа Яна Караля Чапскага адкрылася Мінскае рамеснае крэдытнае таварыства.

1926 год — нарадзіўся Мікалай Пятровіч Кругавых, беларускі пісьменнік. Працаваў на кінастудыі «Беларусьфільм», у Саюзе пісьменнікаў Беларусі. Асноўная тэма творчасці — вайна: «Гонар ярма не прымае», «Дзе не чакаюць цішыні», «Дарога ў мужнасць», «Не дзеля славы» і інш. Аўтар сцэнарыя мастацкага фільма «Абочына».

1931 год — нарадзіўся Уладзімір Ігнатавіч Бровікаў, беларускі партыйны і дзяржаўны дзеяч, журналіст, дыпламат, кандыдат філасофскіх навук. З 1965-га — на журналісцкай і партыйнай працы ў Віцебскай вобласці. З 1969-га — рэдактар газеты «Віцебскі рабочы», сакратар Віцебскага абкама КПБ. У 1972—1978 гг. — у апараце ЦК КПСС. З 1978-га — другі сакратар ЦК КПБ, з 1983-га — старшыня Савета Міністраў БССР. У 1986-1990 гг. — Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол СССР у Польшчы.

1951 год — нарадзіўся Аляксандр Арсеньевіч Варанецкі, акцёр цырка, заслужаны артыст Беларусі. Аўтар шматлікіх клаўнад і рэпрызаў. Зняўся ў тэлестужках «Дзяніскіны апавяданні», «Навагодні атракцыён», «А таксама цырк».

2016 год — адбылося адкрыццё комплексу будынкаў Пасольства Туркменістана ў Мінску.

У свеце

1806 год — нарадзіўся Андрэй Мікалаевіч Мураўёў, камергер расійскага імператарскага двара. Праваслаўны духоўны пісьменнік і гісторык царквы, паломнік і падарожнік, драматург, паэт. Ганаровы член Імператарскай акадэміі навук.

1921 год — нарадзіўся Фарлі Моўэт, канадскі пісьменнік. Ваяваў у Еўропе ў Другую сусветную вайну, сустрэўся на Эльбе з савецкімі салдатамі. Моўэт стаў біёлагам і здзейсніў некалькі падарожжаў па канадскай Поўначы, якія далі матэрыял для яго самых вядомых твораў. Кніга «Не крычы, ваўкі!» стала папулярнай і ў СССР.

1926 год — маршал Юзэф Пілсудскі арганізаваў ваенны пераварот і ўсталяваў у Польшчы дыктатуру — так званы санацыйны рэжым.

Так гаварыў...

ЯНКА СІПАКОЎ:

«Думаць, што ён самы разумны, можа толькі самы дурны чалавек».

УСМІХНЕМСЯ

Анжэла заўсёды глядзела толькі наперад. Ніколі не азіралася назад. Нават калі паркавалася.

— А вы калі-небудзь задумваліся пра тое, што каробка з-пад піцы квадратная, а сама піца круглая, а кавалачкі трохвугольныя.

— Мужчына, купіце кветачкі сваёй жанчыне, а то я ўжо замерзла тут стаяць.

— А колькі вы за іх хочаце?

— 25 рублёў.

— Вам трэба цяплей апранацца.

Стаматолаг:

— Спакойна, Генадзь, усё калісьці бывае ў першы раз.

— Я не Генадзь!

— Я ведаю! Гэта я сабе.

— Мужчына, вы так на мяне глядзіце, быццам вам няма дзе пераначаваць.



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы
тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1262.

Нумар падпісаны ў 19.30 11 мая 2021 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12